Источник: «Звязда» — 09–11–2023 — (Прил. «ЧЫРВОНКА. Чырвоная змена»)

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

9 11 2023 г.

*У ліку найлепшых*

# ВЫБРАЛІ «СТУДЭНТА ГОДА СТАЛІЦЫ»

**У Палацы культуры чыгуначнікаў адбыўся грандыёзны фінал Мінскага гарадскога этапу рэспубліканскага конкурсу «Студэнт года». Свае ўстановы вышэйшай адукацыі прадставілі і пазмагаліся за выхад у фінал 12 пераможцаў адборачных тураў.**



Фота БелТА.

У гэтым годзе канцэпцыяй гарадскога тура конкурсу «Студэнт года» сталі «Эксклюзіўныя авіялініі». Удзельнікаў чакала насычаная праграма: творчыя нумары, дэманстрацыя прамоўніцкага майстэрства па зададзеных тэмах. Інтэлектуальны тур (абарона праектаў) прайшоў напярэдадні фіналу.

Варта адзначыць, што на працягу двух тыдняў канкурсанты прайшлі сапраўдны творчы марафон: майстар-класы на згуртаванне, па дэфіле ад «Міс Мінск — 2023» Надзеі Толсцікавай, курсы па прамоўніцкім майстэрстве ад тэлевядучага Жана Сянкевіча, лекцыі аб асабістым брэндзе і правільнай абароне праекта ад дырэктара «Белбрэндаўдыт» Валянціны Дыніч, рэпетыцыі, прымеркі і падбор калекцый.

Пераможцай гарадскога этапа конкурсу «Студэнт года» стала студэнтка Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта Юлія Левіна. Яна падзякавала арганізатарам конкурсу і сваёй камандзе, а таксама адзначыла, што падрыхтоўка была вельмі складанай, але ўсе намаганні поўнасцю апраўдаліся. Цяпер дзяўчына прадставіць Мінск на рэспубліканскім этапе конкурсу. Другое месца заняў студэнт Міжнароднага ўніверсітэта «МІТСО» Іван Осіпаў, а трэцяе падзялілі паміж сабой студэнтка БДУ Стэфанія-Віталія Віннічак і студэнтка БНТУ Арына Колесава.

Галоўная задача конкурсу «Студэнт года» — аб'яднаць моладзь, бо падчас адборачных тураў юнакі і дзяўчаты знаёмяцца адзін з адным і ствараюць сумесныя праекты. Аб гэтым сказаў першы сакратар Мінскай гарадской арганізацыі БРСМ Раман Бандарук: «Мы спадзяёмся, што з кожным годам усё больш студэнтаў будзе даведвацца аб гэтым конкурсе і пачне прадстаўляць сваю ўстанову адукацыі». На яго думку, інтэлектуальныя і творчыя маладыя людзі, якія ўдзельнічаюць у конкурсе, з'яўляюцца гонарам сваіх навучальных устаноў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**